**УДК 39**

# ЛАЗНЯ Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КАРЦІНЕ СВЕТУ БЕЛАРУСАЎ ПАДЗВІННЯ

***Д. В. ЖУКАЎ***
***(Прадстаўлен: д-р гіст. навук, дац. У. А. ЛОБАЧ)***

*Лазня ў міфалагічных павер'ях беларусаў з’яўляецца локусам з выразным межавым статусам і звязана з дзейнасцю нячыстай сілы. Яна размешчана на “мяжы” сялібы паміж “сваім” і “чужым” светам і фігуруе як месца жыхарства адмысловага міфалагічнага персанажа – Лазніка, які і выступае яе “гаспадаром”. Лазня з’яўляецца месцам кантакту з іншасветам і таму найбольш эфектыўнай прасторай для чарадзейства, магіі, варажбы. У традыцыйнай карціне свету амбівалентны статус лазні ў памінальныя дні суадносіцца з душамі памерлых продкаў, але з другога боку, яна можа быць звязана з нячыстай сілай.*

***Ключавыя словы***: *лазня, нячыстая сіла, падзел прасторы, небяспечнае месца, іншасвет.*

Паводле народных уяўленняў, нячыстая сіла можа з’яўляцца чалавеку не толькі ў прыродных локусах, але і ў прасторы, засвоенай чалавекам, асабліва ў тых месцах (дарога, ростані, лазня), якія маюць выразную сімволіку “мяжы” паміж “сваім” і “чужым” светам. Для традыцыйнай свядомасці “быў уласцівы падзел прасторы на “свой”, “гэты” (прыналежны, засвоены чалавекам) і “чужы”, “той” свет, які ў залежнасці ад кантэксту мог разумецца як свет памерлых, сакральная, боская сфера (неба, вырай) ці інфернальная зона (свет “нячысцікаў”)” [3, с. 294]. Невыпадкова, што вельмі часта ў аповядах пра нячыстую сілу фігуруе лазня, якая звычайна размешчана не побач з домам і хлевам, а на мяжы сялібы *“Вот мы, маладзёж, падышлі раз паглядзець. Аж там (у бані) хахочуць, плёскаюць. Я адкрыла баню, аж там чэрці. І ў катле, і ў баку. Касматыя такія, валасы длінныя, ніжы жопы, чорныя, закапцелыя, ногі ў катлах ня відна. У меньшых рожкі меньшыя, у большых большыя. Яны на нас дажа і не глянулі. А назаўтра прышлі, аж вада ўся павыліта”* (Шумілінскі р-н) [5, с. 98].

Калі вядомы этнограф Е. Раманаў пералічваў месцы знаходжання чорта, ён таксама ўзгадваў лазню: “Галоўным месцазнаходжаннем Чарцей лічацца балоты, асабліва бурыя, тарфяныя... Другім любімым месцам знаходжання Чарцей лічацца лазні. У вольны час Чэрці гоняць смалу, у якой гараць у пекле грэшнікі” [7, с. 286].

Як нежылы будынак, лазня пазбаўлялася такіх адзінак чалавечай прасторы, як абразы, свечкі і падобныя ім атрыбуты, і таму належала да месцаў патэнцыйнай прысутнасці чужога і варожага. Лазня можа з’яўляецца адным з месцаў жыхарства нячысціка, бо яна падобная да хаты, але ў ёй адсутнічае хрысціянскі абраз, які выконвае функцыю абярэга як ад чорта, так і ад яму падобных нячысцікаў. Менавіта таму ў народных былічках лазня часта фігуруе як месца сустрэчы чалавека і чорта. *“Ды я чарцей узапраўду бачыла. Я ж малая тады была. Гадоў можа дзесяць-адзінацаць. Жылі мы тады на хутары. Там, за мастом, па гэтым беразе. І вось зімой неяк мыліся ў бані. Памыліся. Пайшлі ў хату. Холадна яшчэ так было. Маці мне кажа: “Збегай, паглядзі, нехта ў нашай бані парыцца”. А там і ўпраўду дым з трубы ішоў, як нехта парыцца. І вось забяжала я ў прадбаньнік і дзьверы адкрыла. Ай! А там мужыкі голыя стаяць, хлешчуць, паруцца! А галовы чорныя, чорныя і хвасты. Хвасты – длінныя, а на канцы – мяцёлка такая. Самое цела бела, а вось галава чорная, чорная. Касматыя такія ў іх галовы. Во, як вас цяпер бачу, так і іх бачыла. Рагоў і капытоў не замеціла, гаварыць ня буду. Только галовы чорныя і хвасты. Ай, як пабегла я назад, прыбегла, сказала: “Якійсці мужчыны мыюцца з хвастамі”, а маці паслухала і туды ўжо не пашла. А я патом гэтай бані баялася і ў яе не хадзіла. У другую хадзіла. І чарцей больш не відзіла”* (Расонскі р-н) [5, с. 99]. Трэба дабавіць, што нячыстая сіла ў лазні магла праяўляцца ў розным аблiччы, напрыклад, у аблiччы зайцаў, якіх напускае чараўнік:*“[…] Было яшчэ адно здарэньне. Адзін вядзьмак запрасіў да сябе ў баню мужыкоў памыцца. Яны прыйшлі туды, глядзяць, а ў бані поўна зайцаў. А гэта ж не зайцы – гэта ж былі на самой справе чэрці”* (Бешанковіцкі р-н) [6, с. 41].

Аднак, у лазні чалавек можа сустрэцца не толькі з чортам, але і з не менш злосным нячысцікам – лазнікам. Вось як яго апісваў Е. Раманаў: “Лазеннік жыве ў лазні пад палком... Гэта злы дух, які выглядам нагадвае Вадзяніка” [7, с. 289]. Аб тым, чым небяспечны Лазнік для беларусаў, падрабязна апісаў вядомы этнограф Мікалай Нікіфароўскі: “цярпець не можа гультаёў, а тым больш - несвоечасовых наведвальнікаў, якіх палохае ненатуральным храпам, шыпеннем, паімёнными заклікамі, віскам, стукам у сцяну, варочаннем камянёў у лазні на каменцы, рогатам і інш. Зларадны рогат пужае запозненых у лазні жанчын, вымушаных уцякаць голымі. Ад пужання Лазніка не ўратавацца і тым, хто задумаў бы мыцца ў лазні пасля апоўначы: у іх ён кідае смеццем, нават камянямі, а пры вострым выпадку можа нават загубіць парушальніка спакою” [4, с. 60].

Вельмі часта Лазніка блытаюць з чортам, альбо аб’яднoўваюць іх вобразы ў адзін, называючы Лазніка чортам і наадварот: *“У Чудзянах пашла дзеўка замуж за старыка. І ніяк яна не звала яго, як стары чорт, вэдлуг шутак. І хлопчык у іх радзіўся. Ну, пашла яна ў лазню і хлопчыка ўзяла. І гавора старыку: Я ж, — гавора, послі лазні аслабею, дык ты, стары чорт, прыдзі і вазьмі хлопчыка. Пад лазнею пасядзі, я гукну цябе, ты й панясеш яго дамоў. Ну, пашлі ў лазню, яна туды-сюды яго скарэй абмыла, дзверы расчыніла: Ці тут ты, стары чорт? Тут! Ну, на ж, вазьмі яго. А, давай, давай. Яна аддала, ён і панёс. Стала тагды яна мыцца, а мужык прыходзе: Прося, давай хлопца. Нешта ты доўга яго мыеш? Якога хлопца, я ж табе аддала. Калі? Стала ей ета жалка, і яна абрабела... Прыходзе дамоў няма хлопца. Туды-сюды — так і пaноніча няма. Аддала старому чорту, ведама, банніку”* [2, с. 165]. Так адбываецца з-за таго, што Лазнік з’яўляецца больш злосным за іншых сядзібных нячысцікаў. Згадваць чорта лічылася непажаданым, бо гэта прыцягвала нячыстую сілу і дазваляла ёй рабіць тое, у кантэксце чаго яна была прыгаданая. Але няма сведчанняў таго, што гэтую функцыю пераняў да сябе Лазнік.

З некаторых былічак вынікае, што каля лазні, як патэнцыйна небяспечнага месца, чалавек мог страціць арыентацыю ў прасторы: *“Вот мой дзядуля казаў, што кажыць: “Я ні знаю, Бог ці ёсьць, а нячыстая сіла ёсьць”. Вот выперліць яна там, так ён так мучыцца поўкіламетра… Хадзіў баню тапіць, ідзець адтуль, нібыта прыйдзіць да хаты, але ўсё роўна ні дайдзіць да хаты – узноў варочаецца. Нехта вадзіў і ўсё. Вось такое! Ну ён так, памоліцца Богу, папросіць Бога і кажыць: “Божанька, астаў мяне ўжо на маім месці! Чаму мяне гэтак водзіць?” Ну і пройдзіць гэта ўсё. А болей такога нічога. Болей ж усё к Богу мы абрашчаліcь. Мы ж толькі Бога верылі і ўсё, вот”* (Мёрскі р-н) [5, с. 102]. З гэтай цытаты вынікае, што ў крытычнай сітуацыі выратавальным ёсць зварот чалавека да божай дапамогі пасродкам малітвы ці нават простага жагнання.

Лазня з’яўляецца месцам кантакту з іншасветам і таму найбольш эфектыўнай прасторай для чарадзейства, магіі, варажбы. Як адзначыў У. Коваль: “Пры гэтым рытуальная “нячыстасць” лазні падкрэслівалася тым, што дзяўчына, якая апоўначы накіроўвалася для варажэння ў лазню, сімвалічна «ператваралася» у ведзьму: здымала з сябе нацельны крыж, пояс, распускала валасы, заставаласяў адной сарочцы. У лазні маглі адбывацца і іншыя рытуалы“чорнай магіі”: напрыклад, вядзьмар “выймаў” з зямлі след ненавісніка і спальваў яго з замовамі апоўначы ў лазні, імкнучыся выклікаць хваробу ці нават смерць таго, на каго быў накіраваны гэты рытуал” [1, с. 95].

Калі чараўніца адбірае малако ў кароў, яна ператвараецца ў жабу з чалавечамі рукамі і хаваецца ў лазні, аб чым сведчыць наступная цытата: *“Мая мама расказавала, карова не стала малака даваць. Наверна, прама посьлі Купалы. Гаворуць, нада чэраз печку ў бані, прама чэраз каменьне праліць вады. Тры разы. Яна раз праліла, другі раз праліла харашо – у таз, а трэцьці станець ліць, а яно ўсё па печкі разьбяжыцца тая вада і ў таз нісколькі ні пападала. Трэцьці раз бяжыць яна за вадой, а там сядзіць такая лягушка ў прыбаньніку на скамейцы. Такія, гаворыць, рукі як у чалавека, лапы красныя, здаровыя. А яна як дала гэтым тазам. Алі ні папала па ей. А тая чэраз пляцень і ў крапіву. Ну і ўсё. Прынісла праліла вады і ўсё як нада. Во як было”* (Бешанковіцкі р-н) [6, с. 5].

З другога боку, лазня, як памежная прастора, фігуруе ў знахарскіх практыках у якасці месца, дзе хвароба выдаляецца ў іншасвет: *“Падрыў? Гэта залатнік завуць. Жывот баліць, вот удаўніш і ён, кажыць, ужо косы папускаў. І тады даець у бакі, і сам не знаеш, усё там баліць. Тады лечаць, сціраюць, вот прымерна ў бані, як у каго дужа запусціць. У нас быў мужчына, мужчыны прыхадзілі к яму лячыцца. Баню вытапіць і тады загаварываіць, сціраіць, усё сціраіць накрыж к пупу, накрыж, і сціраіць. А тады ў яго яшчэ быў такі кубачак гліняны небальшы, і тады ставіць яшчэ гэты кубачак на жывот, на пуп, скарынку хлеба атрэжыць такую невялічкую, і тады лёну кужалю так зробіць, і тады гэтыя капціркі пхнець, і запаліць. І тады гэты кубак – хлоп – і ён нацягнець”* (Докшыцкі р-н) [6, с. 173].

Лазню выкарыстоўвалі таксама як месца традыцыйных калядных варожбаў: *“У поўнач можна толькі ў бані гадаць. На Каляды. Ідуць у баню. Ставюць там зеркала проціў зеркала, там атражэнняў тады многа. І вот нада раздзецца. Абкрыцца белай простынню і глядзець у зеркала, якая там выява пакажацца. Дык вот… Другія дзяўчаты сядзелі ў прыбанніку, а адна дзяўчына пашла гадаць. Ці праўда ці не… І так уўлеклася, ці ей там хлопец паказаўся такі красівы. І падарыў ей бусы. На шыю накінуў бусы. І яна рукой узялася, аказалася, што эта – вяроўка, што чорт накінуў вяроўку. (Смяецца) Вот гаворуць, што як толькі паявіцца выява ў зеркалі, нада быстра закрываць”* (Сенненскі р-н) [5, с. 98]. З ліку каляндарных абрадаў, у якіх задзейнічана лазня, таксама вылучаецца Купалле.

Лазня мае амбівалентны статус у традыцыйнай карціне свету: як месца на мяжы светаў, яна можа быць звязана з нячыстай сілай, але з другога боку – з душамі продкаў, для якіх лазню абавязкова топяць на восеньскія Дзяды *“На Дзяды, хто баньку гэту робіў – гэта жывым, каб здароўе было, а хто на тым свеце, каб пакой вечны атрымалі. Дык кожны раз, як таплю баньку то таго памяну, то таго. Мая братава казала, што яна ўжо пазвала была дзядоў, каб усе ішлі мыцца. У баню. А тут прыйшоў малец, яшчэ ня мыўшыся, з сяла нейкі. Пайшоў, прыпазьніўся, а яны, тыя дзяды, кажа, жужжаць ва ўсіх кутках. Ён скорэнька надзеўся і пабег дамоў нямыты”* (Докшыцкі р-н) [6, с. 225].

Такім чынам, лазня ў міфалагічных павер'ях беларусаў — гэта локус з выразным межавым статусам, звязаны з дзейнасцю нячыстай сілы, месца далучэння чалавека да іншага свету. Лазня выкарыстоўвалася для варажбы, чарадзейства і знахарскіх практык. Лазня з'яўляецца адным з месцаў жыхарства нячысцікаў, бо яна падобная да хаты, але пазбаўлена такіх прыкмет чалавечай прасторы, як абразы, свечкі і падобныя хрысціянскія атрыбуты, якія выконваюць функцыю абярэга як ад чорта, так і ад яму падобных нячысцікаў. Лазня ў народнай традыцыі фігуруе як месца жыхарства адмысловага міфалагічнага персанажа – Лазніка, які і выступае "гаспадаром" лазні. Ён лічыцца найбольш злосным сярод іншых сядзібных нячысцікаў, што тлумачыцца месцазнаходжаннем лазні на "мяжы" паміж "сваім" і "чужым" светам.

ЛІТАРАТУРА


1. Коваль У. І. Народныя ўяўленні, павер'і і прыкметы: Даведнік па ўсходнеславянскай міфалогіі / У. І. Коваль – Гомель: Беларускае Агенцтва навукова–тэхнічнай і дзелавой інфармацыі, 1995. – 180 с.
2. Легенды і паданні / [Склад. М. Я. Грынблат і А. І. Гурскі; Рэд. тома А. С. Фядосік]. – Мн.: Навука і тэхніка, 1983. – 544 с.
3. Лобач, У. Міталёгія прасторы ў творах Яна Баршчэўскага / У. Лобач // Сонца тваё не закоціцца, і месяц твой не схаваецца : зборнік артыкулаў па беларусістыцы і багаслоўі ў гонар 80–годдзя з дня нараджэння і 50–годдзя святарства айца Аляксандра Надсана / укл. І. Дубянецкая; пад рэд. І. Дубянецкай [і інш.]. – Мінск: Тэхналогія, 2009. – С. 294–308
4. Никифоровский Н.Я. Нечистики, свод простонародных в Витебской Белоруссии сказаний о нечистой силе / Н.Я. Никифоровский. – Витебск: Паньков, 1995. – 85 с.
5. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача.– Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 1. – Наваполацк: ПДУ, 2011. – 292 с.
6. Полацкі этнаграфічны зборнік / уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобача. Вып. 2: Народная проза беларусаў Падзвіння. У 2 ч. Ч. 2. – Наваполацк ПДУ, 2011. – 368 с.
7. Романов Е. Р. Белорусский сборник. Вып. 8: Быт белоруса / Е.Р. Романов. – Вильна: Типография А.Г, Сыркина, 1912. – 600 с.